Прааналізаваны матэрыял паказвае, што канфесіянальная лексіка "Хронікі" М. Стрыйкоўскага даволі багатая і разнастайная, ахоплівае ўсе сферы рэлігійнага жыцця. Словы спрадвечна беларускага паходжання складаюць невялікую частку разгледжанай лексікі, большасць рэлігійных тэрмінаў – запазычанні з іншых моў, што тлумачыцца перакладным характарам помніка. Словы, звязаныя з праваслаўем, прыйшлі са стараславянскай мовы праз старажытнарускую. Група лексікі, якая мае адносіны да каталіцкага веравызнання, пранікла з заходнееўрапейскіх моў праз пасрэдніцтва польскай.

**Л.Д.Побаль**, член-карэспандэнт
Міжнароднай славянскай акадэміі навук

## СЛАВЯНЕ Ў ГІСТАРЫЧНЫХ КРЫНІЦАХ ВІЗАНТЫЙСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ: V – X стст.

Магутная Візантыйская імперыя праіснавала ад часоў уладарства першага імператара Канстанціна I Вялікага (306 – 337 гг. н.э.) і да 29 мая 1453 г. Апошнім (101-м) імператарам быў Канстанцін XII Палеалог Драгаш (1448 – 1453 гг.).

Як вядома, пры першым з уладароў адбыўся падзел Рымскай рабаўладальніцкай імперыі на дзве часткі: заходнюю і ўсходнюю. Менавіта апошняя паступова пераўтварылася ў магутную раннефеадальную імперыю з праваслаўнай хрысціянскай абраднасцю.

Варта адзначыць, што вялікія абшары Еўропы ад "індаеўрапейскіх часоў" былі асвоены славянскай, грэчаскай і іншымі групамі індаеўрапейцаў. Значныя землі паўночнай часткі Візантыйскай імперыі са старажытнага перыяду былі заселены родаабшчыннымі аб'яднаннямі славян, земляробамі-жывёлаводамі з язычніцкімі светапоглядамі. У розных рымскіх і візантыйскіх пісьмовых крыніцах аб балканскіх славянах, нашых далёкіх родзічах, захаваліся фрагментарныя пісьмовыя звесткі. Яны і цяпер маюць вялікую навуковую каштоўнасць у агульнаславянскай праблематыцы.

Аўтара цікавяць звесткі ў першую чаргу да сярэдзіны X ст., да ўладарства імператара (55), калі прыняла хрысціянства ад Візантыі старажытнаруская княгіня Вольга.

Як вядома, вялікую ролю ў гісторыі ўсіх славян адыгралі асветнікі-грэкі: Канстанцін (Кірыл) і Мяфодзій. Яны спачатку вывучылі абшчынную ("вясковую") мову славянскіх пасяленцаў горада Салуня (Фесалонікі) і яго наваколля і на базе грэчаскага

алфавіта выпрацавалі славянскую азбуку. На гэтай мове сталі пісаць кнігі. Афіцыйна асветнікі з 863 г. пачалі сваю асветніцкую дзейнасць сярод славянскіх княстваў, дзяржаў, у тым ліку ў Мараўскай славянскай дзяржаве, якая ахоплівала вялікія прасторы ў цэнтральнай частцы Еўропы. Старажытнасці таго часу адносна добра вывучаны гісторыкамі, археолагамі Чэхіі, Славакіі, Венгрыі, Югаславіі, Польшчы і іншых краін. Так, славянская пісьменнасць на салунскім абшчынным дыялекце была распаўсюджана далёка за межамі Візантыі, дасягнула межаў Русі, яна вядомая як "царкоўнаславянская", "старажытнаславянская". Гісторыя славян на Балканскім паўвостраве, у межах паўднёвай Еўропы, умоўна можа быць раздзелена на тры перыяды: I – гісторыя славян ад першапачатковых звестак аб іх і да сярэдзіны IX ст. н.э.; II – гісторыя славян з 863 г. і да сярэдзіны X ст., да пачатку хрышчэння Вольгі, а пазней Уладзіміра (988 г.); III – гісторыя славян ад другой паловы X ст. і да сярэдзіны XV ст. Аўтара цікавяць у першую чаргу два першыя перыяды.

Ніжэй прыводзяцца ў храналагічнай паслядоўнасці звесткі аб славянах першага, больш старажытнага часу. Тут можна заўважыць, што, напрыклад, у рымскіх крыніцах славяне вядомыя пад назвай венеды (венеты) з першых вякоў нашай эры і нават яшчэ раней. У самы старажытны перыяд гісторыі славян у Візантыі ўладарамі былі сорак шэсць імператараў. Значныя падзеі ў гісторыі славян адбываліся пры ўладарстве пятнаццаці імператараў ( 1: 17, 19, 22, 23, 25, 28, 29, 30, 33, 36, 37,40, 42, 44, 46).

(17) Анастасій I Дзікор (491 – 518 гг.). У гады яго ўладарства адбываліся ваенныя канфлікты са славянамі, аварамі, балгарамі-гунамі, асабліва ў 493 г. і пазней. Пісьмовыя крыніцы за 513 – 514 гг. сведчаць, што славяне і балгары кантралявалі абшары зямель, якія пасля адміністрацыйнага падзелу імперыі называліся Скіфіяй, Фракіяй і г.д.

(19) Юстыніян I Вялікі (527 – 565 гг.). Вядомы гісторык Пракопій Кесарыйскі запісаў, што калі Юстыніян прыняў уладу над дзяржавай, "... гуны, славяне і анты" вялі практычна штогод ваенныя дзеянні", "балгары", калі іх у 533 г. візантыйцы "адціснулі за Дунай", але ўжо ў 537 г. – "варвары", пад якімі разумеліся і славяне, і іншыя народы, дасягнулі ўмацаванняў сталіцы. У канцы 40-х гадоў славяне валодалі землямі ў басейне Дуная і дасягалі горада Дзірахея, на беразе Адрыятычнага мора, у межах Македоніі. У 551 г. славяне дасягнулі Салуня, аднак вымушаны былі адступіць. У 559 г. славяне і балгары валодалі вялікімі абшарамі Балканскага паўвострава да Фермапіл і Херсанеса Фракійскага. Візантыя пачала

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з “варвараў” ствараць наёмную армію, у якую ўваходзілі славяне, готы, гуны, гепіды. Гістарычна вядома, што для абароны Рыма ў 535 г. супраць Віціліса, кіраўніка готаў, Візантыя накіравала 1600 воінаў славян і гунаў. У крыніцах ёсць звесткі, што ў 559 г. славяне і балгары падышлі да сцен Канстанцінопаля.

(22) У 574 – 585 гг. імператарам быў Ціверый ІІ. У крыніцах адзначана, што ў час яго ўладарства ў 577 – 578 гг. 100 тысяч славян разбурылі Фракію і Эладу, палкаводцам быў князь Даўрыд, пазней ён загінуў ад аварскага кагана Баяна. Іаан Эфескі ў пачатку 80-х гадоў VI ст. назваў “склавінаў” – “пракляты народ” за тое, што “яны імкліва прайшлі ўсю Эладу, вобласць Фесалонікі, усю Фракію і захапілі многія гарады і ўмацаванні”, сталі “гаспадарамі гэтай зямлі”.

(23) Маўрыкій (582 – 602 гг.). У перыяд яго ўладарства “цяжкія войны вяліся з аварамі і славянамі”. У 597 г. у каторы ўжо раз славяне аказваліся ля г. Фесалонікі (Салуня).

(25) Іраклій (610 – 641 гг.). На землях Ілірыка (заходняя частка імперыі) складваліся славянскія дзяржавы. У 626 г. з Фракіі авары з падпарадкаванымі славянамі накіроўваліся да Канстанцінопаля. Адзначана, што славяне знаёмыя з марашлаваннем і ім даручалася штурмаваць сталіцу з мора. З лодак і платоў быў сфарміраваны флот.

(28) Канстант ІІ (641 – 688 гг.). Падчас яго ўладарства ўзнікалі пагрозы імперыі ад арабаў, лангабардаў, славян. Аднак у 658 г. Канстант ІІ арганізаваў паход супраць македонскай “Склавоніі”, падпарадкаваў славян у наваколлях Карынфа.

(29) Канстанцін IV Палганат (668 – 685 гг.). Падчас яго ўладарства Аспарух, сын балгарскага хана Кубрата, стварыў стотысячную армію. У выніку ў 681 г. Візантыя прызнала незалежнасць першага Балгарскага царства, сталіцай якога была Праслава. Аўтар гэтых радкоў у 1980 г. вывучаў старажытнасці першай сталіцы Балгарыі, атрыманыя балгарскімі даследчыкамі. У горадзе захаваліся часткі архітэктурных пабудоў ад тых часоў.

(30) Юстыніян Рынатмет (685 – 695 і 705 – 711 гг.). У 688 г. ён выступіў супраць балгар і славян. У выніку ваенных дзеянняў 30 тысяч славянскіх воінаў са сваімі сем’ямі былі пераселены ў Віфінію (Малая Азія). Вядома, што 20 тысяч воінаў-славян са сваім военачальнікам Гебулам выступілі супраць Візантыі, перайшлі на бок сарацынаў ля Кілікійскага горада Севастопаліса. У выніку помсты Юсцініян ІІ знішчыў сем’і славянскіх воінаў. З гістарычных крыніц вядома, што ў 705 г. воіны балгар і славян ужо ў каторы раз нечакана з’явіліся ля сцен Канстанцінопаля.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(33) Філіпік (Вардан) (711 – 713 гг.). Падчас яго імператарства вядома, што балгары і славяне рабілі набегі на землі Фракіі.

(36) Леў III Ісаўр (Сірыец) (717 – 741 гг.). Пры ім былі распрацаваны юрыдычныя законы, палажэнні "Эклогі", якія пазней трапілі і ў судзебнікі славянскіх дзяржаў Расіі.

(37) Канстанцін V Капронім (Кавалін) (741 – 775 гг.). У перыяд яго ўладарства ў 765 г. еўнух славянін Мікіта стаў патрыярхам. Яго папярэднік у 764 г. быў забіты за ўдзел у змове супраць імператара. У перыяд з 744 па 748 г. у Канстанцінопалі ад чумы загінула шмат люду. У горад была перасёлена вялікая колькасць насельніцтва, у лік якога ўваходзілі і славяне. Вядома, што ў межах 755 – 775 гг. Канстанцін V зрабіў дзевяць паходаў супраць Балгарыі, напаў на ўладанні князя македонскіх славян Склавуна, перамог яго. Па звестках Нікіфара, канстанцінопальскага патрыярха і храніста, 208 тысяч славян было перасёлена ў Малую Азію. Не выключана, што і да нашых дзён там яшчэ пражываюць нашчадкі тых далёкіх балгарскіх славян.

Тут можна прывесці звесткі аб назвах тэрытарыяльных аб'яднанняў родаабшчынных структур "Македонскіх славян": велегізіты, драгавіты, ранхіны, сагудаты, бярзіты, струмляны, смаляны і інш.

(40) Імператрыца Ірына (780 – 790 і 797 – 802 гг.).

(41) Канстанцін VI (790 – 797 гг.). У барацьбе за ўладу другі раз, летам 797 г., перамагла Ірына. Канстанцін VI быў адхілены ад улады, асеплены. У падтрымку сына Канстанціна VI Нікіфара на пасаду імператара супраць Ірыны паднялі паўстанне славяне Грэцыі пад кіраўніцтвам князя Вяселічаў Аксаміра. Паўстанне было падаўлена, яшчэ пяць гадоў прадаўжала ўладарства Ірына.

(42) Нікіфар I Генік (802 – 811 гг.). У перыяд яго ўладарства з 803 г. пачалася "хрысціянізацыя славян Грэцыі" і адначасова "элінізацыя". Адбывалася перасяленне славян у акругу, дзе ўся ўлада належала страцігу, камандзіру войска: Дзерарохі, Пелапанэса, а на іх месцы перасялялася насельніцтва з Малой Азіі. З пісьмовых звестак вядома, што ў 811 г. Нікіфар спаліў сталіцу балгараў Пліску, але і сам загінуў.

(44) Міхаіл I Рангава (811 – 813 гг.). Мяркуецца, што яго прозвішча "Рангава" абазначае ў славянскай інтэрпрэтацыі "чалавек моцнай рукі".

(46) Міхаіл II Траўл (820 – 829 гг.). Падчас яго ўладарства адбылося паўстанне пад кіраўніцтвам Фамы Славяніна, якое ахапіла амаль усю імперыю. Вядома, што кіраўнік паўстання пачаў ваенную службу яшчэ пры Ірыне, пазней перайшоў да арабаў. У пэўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абставінах Антыяхійскі патрыярх асвяціў Фаму Славяніна ў якасці імператара. Да 821 г. амаль увесь усход імперыі знаходзіўся пад яго ўладарствам. Яго падтрымлівалі сялянская бедната, рабы і іншыя групы насельніцтва. На пабудаваных караблях армія Фамы Славяніна даплыла з Малой Азіі да Фракіі. Тут да яго далучыліся мясцовыя славяне і армянскія перасяленцы. У снежні 821 г. паўстанцы падышлі да сцен сталіцы, асада горада цягнулася год. Аднак сталіца не была ўзята. Неўзабаве паўстанне пацярпела паражэнне.

Другі перыяд (II) гісторыі славян на Балканах, у паўднёвай Еўропе, ахоплівае, па сутнасці, адно стагоддзе – з сярэдзіны IX да сярэдзіны X ст. Аднак у гісторыі славян у гэты адносна кароткі час адбываліся важныя падзеі. Яны адлюстраваны ў перыядзе ўладарстваў пяці імператараў: 49, 50, 51, 54, 55.

(49) Міхаіл III (856 – 867 гг.). Падчас яго ўладарства ў 860 г. са Старажытнай Русі да Канстанцінопаля адбыўся водным шляхам на лодках "паход рускіх князёў". Гэтыя даныя знайшлі адлюстраванне ў гістарычных крыніцах, у тым ліку і ў Іпацьеўскім летапісе (Полное собрание русских летописей – ПСРЛ. – СПб., 1908. – С. 12, 13). Пры яго праўленні пачалі праводзіць, як гаварылася вышэй, сярод славян сваю асветніцкую дзейнасць Кірыл і Мяфодзій. Славянская пісьменнасць адыграла рашаючую ролю ў распаўсюджанні культурных здабыткаў мінуўшчыны сярод славян і фарміраванні многіх славянскіх дзяржаў у Еўропе. Старажытная Русь выйшла на вялікія еўрапейска-азіяцкія прасторы.

(50) Васілій I Македанянін (867 – 886 гг.). З гістарычных крыніц вядома, што ў перыяд яго ўладарства сваю асветніцкую дзейнасць праводзіў Андрэй: "русамі" было прынята хрысціянства. Мяркуецца, што гэтыя падзеі былі звязаны з тэрыторыяй пад назвай "Прыазоўская Русь". Не выключана, што гэтая зямля знайшла сваё адлюстраванне ў "Слове пра паход Ігаравы" (Мн., 1986. – С. 22).

(51) Леў VI Філосаф (886 – 912 гг.). Візантыя заключае дагавор са Старажытнай Руссю. Вядома, што сумесна з Візантыяй у ваенным паходзе на востраў Крыт удзельнічалі некалькі соцень рускіх дружыннікаў. Аб'яднаная эскадра вясной 912 г. пацярпела паражэнне на моры ля вострава Самоса.

(54) Раман I Лакапін (920 – 945 гг.). Падчас яго ўладарства адбываліся народныя паўстанні славян. У 921 г. славяне адзначаны ў самай паўднёвай частцы Грэцыі – у Пелапанесе. Вядома, што візантыйскі ваенны начальнік Сімяён Балгарскі ў 926 г. пацярпеў паражэнне ад харватаў. У 944 г. адбыўся ваенны паход рускага князя Ігара ў Візантыю.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(55) Канстанцін II Парфірагенэт (945 – 959 гг.). Кіеўская князёўна Вольга ў 855 г. падчас падарожжа ў Канстанцінопаль прыняла хрысціянства. З летапісных даных вядома, што першыя два хрысціянскія храмы ў Беларусі, менавіта ў Віцебску, збудавала Вольга, якая тут пэўны час пражывала; гэтыя звесткі мала прыводзяцца ў гістарычных распрацоўках.

У заключэнне неабходна заўважыць, што ў сучаснай гістарыяграфіі некаторыя археолагі могільнік Брэст – Трышын і іншыя помнікі беларускага Пабужжа звязваюць з готамі. Але ўсе гэтыя старажытнасці раней на некалькі стагоддзяў за першае ўпамінанне готаў у гістарыяграфіі, якое адносіцца да IV – V стст. і звязана з Падунаўем. Напрыклад, у адным з пахаванняў у Брэсце – Трышыне знаходзілася манета рымскага імператара Траяна (98 – 117 гг.), якая чаканена ў 101 – 103 гг. У Беларусі вядома да сотні месцаў знаходак манет рымскіх імператараў I – II стст. н.э., задоўга да гістарычных звестак аб готах. Украінскі археолаг, доктар гістарычных навук М.Ю. Брайчэўскі зрабіў глыбокі аналіз гоцкай праблематыкі. Ён лагічна і навукова пераканаўча паказаў, што готы–качэўнікі і іх прарадзіма – усход, а не Скандынавія, да германцаў яны не маюць непасрэдных адносін. Са сказанага вынікае, што готы ў Беларусі – надуманае заключэнне, якое не мае навукова-гістарычных падстаў.


1. Полное собрание русских летописей. – СПб., 1908. – Т.2: Ипатьевская летопись. “Славяне” ў недатаванай частцы летапісу прыводзяцца разам і побач з назвамі старажытных краін і народаў: “Египет”, “Ликия”, “Сарматия”, “Скуфия” (с.3). І далей маюцца звесткі на наступных старонках: 5, 8, 12, 13, 24 – 31, 44, 45, 50, 52; Своды древнейших письменных известий о славянах: В 2 т. Т.1. I – VI вв. – М., 1991; 2-е изд., испр. – М., 1994; Т.2. VII – IX вв. – М., 1995.

2. Ганкрелидзе Т.В., Иванов В.В. Индоевропейский язык и индоевропейцы. – Тбилиси, 1984. – Т.1 – 2 .

3. Чигуров И.С. Византийские исторические сочинения. – М., 1980.

4. Всемирная история: В 24 т. – Мн., 1997. – Т.7. Раннее средневековье. – С. 274 – 300, 472 – 523. – Литература.

5. Дашков С.Б. Императоры Византии. – М., 1996.

6. Антолјак С. Средневековна Македонија. – Скопје, 1995. – Т.1. – С. 103. – Прыводзіцца таксама карта назваў славянскіх рода-абшчынных утварэнняў, а таксама пазнейшыя па часе першапачатковыя княствы да VIII ст. ад Чорнага мора на ўсходзе да Альпаў на захадзе, ад Карпацкіх гор і Прычарнамор’я – на поўначы, да самых паўднёвых ускраін сучаснай Грэцыі (“милинзи”, “езерци”, “велегезиты”, “сагудати”, “ринхини” – 610 г. н.э.; “драгувиты”, таксама 610 г. н.э.; “струмляни”, “смоляни”, “словени”, “анти”, “северани”, “дулебы”, “бели Хрвати”, “Моравски словена”, “чешки” – “словени”, “карантанцы” і інш.). Маюцца звесткі аб лакалізацыі на гэтай тэрыторыі і іншых народаў, сярод іх і качэўнікаў (“авари”, “лангобарди”, “гепиди”, “влашки” і інш.).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Панов Б. Средневековна Македонија. – Скопје, 1988. – Т. 3. – С. 42 і інш.

8. Большая Советская Энциклопедия. – 2-е изд. – М., 1956. – Т. 42. – С. 528 – 529.

9. Слова пра паход Ігаравы. – Мн., 1986. – С. 22 і інш.

10. Брайчевський М.Ю. Готи в Надчорноморіине (до постановки проблемы) // Археология. – Київ, 1986. – № 1. – С. 103 – 113.

11. Герберштейн Сигизмунд. Записки о Московии. – М., 1988. – Прыводзяцца звесткі аб назвах розных груп, тэрытарыяльных назвах усіх славян, мясціне іх лакалізацыі па крыніцазнаўчых даных на пачатак XVI ст. “Славянская мова (склавонская, вендская) распаўсюджана вельмі шырока. На ёй размаўляюць далмацінцы, баснякі, харваты, істрыйцы, уздоўж Адрыятычнага мора да Фрыгуля – карны (іх венецыянцы называюць карсамі), жыхары Крайны, карынційцы (дарані Дравы), сербы, балгары ( і іншыя, якія засяляюць тэрыторыю да Канстанцінопаля), чэхі, лужычане, сілезцы, маравы, насельнікі берагоў р. Вага ў Венгрыі (с. 58).

**Мікола Багадзяж**, гісторык,
член Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў

## ДЗЕ ЎЗЯЛІ СЛАВЯНСКУЮ ПІСЬМЕННАСЦЬ КІРЫЛ І МЯФОДЗІЙ?

Традыцыйна лічыцца, што пісьменства ў славянскіх народаў з’явілася дзякуючы намаганням візантыйскіх (хаця той-сёй называе іх балгарскімі) асветнікаў Кірыла (які да пастрыжэння ў манахі насіў імя Канстанціна) і яго брата Мяфодзія. Прыгадаем, што нарадзіліся браты ў сям’і візантыйскага ваеначальніка ў горадзе Салуні (сучасны грэчаскі г. Салонікі), на землях, якія з другой паловы VI ст. масава засяляліся славянамі, у тым ліку і ўсходнімі. Так, напрыклад, аселі ў наваколлях горада дрыгавічы (названыя ў хроніках другавітамі). Гледзячы па ўсяму, гэта частка войска Хакана, які напрыканцы VI ст. зрабіў спробу захапіць Салунь, аднак вымушаны быў спыніць аблогу горада і вярнуцца на радзіму.

А паколькі да 827 г., у які нарадзіўся асветнік Канстанцін, славяне складалі значную частку жыхароў горада і наваколля, знаёмы ён з імі быў з дзяцінства.

Як вядома, Канстанцін прысвяціў сябе не ваеннай справе, як яго бацька і брат, а навукам. За вучонасць і майстэрства ўдзелу ў дыскусіях ён атрымаў мянушку філосафа. Пры двары імператара займаў пасаду галоўнага бібліятэкара. Не аднойчы выконваў дыпламатычныя даручэнні. І вось падчас дыпламатычнагаваяжу да хазар у 680 г. ён сустрэўся ў Корсуні (сучасная Керч) з чалавекам, які, як расказвае напісанае яго братам Мяфодзіем і вучнямі “Жыццё Кірылы…”, меў і чытаў кнігі, напісаныя “рускімі пісьменамі”. А



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ